ТОа
318746

# Беларуская мова 8 клас

## Дыктанты, пераказы, пераклады



Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў

*Пад рэдакцыяй П.А. Міхайлава*

Рэкамендавана ўстановай «Навукова-метадычны цэнтр вучэбнай кнігі і сродкаў навучання» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*2-е выданне*

Мінск
«Аверсэв»
2003

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 808.26(075.3)
ББК 81.2Беи-922
Б43

*Аўтары:*
І. Л. Бурак, П. А. Міхайлаў, Т. А. Мытнік, Н. У. Чайка

Рэцэнзенты:
канд. філал. навук, дац. каф. рыторыкі і методыкі выкладання моў і літаратур Бел. дзярж. ун-та ***І. М. Саматыя***; настаўнік бел. мовы і літ-ры СШ № 2 г. Маладзечна ***Г. Ф. Гусева***

**Беларуская** мова: Дыктанты, пераказы, пераклады:
Б43 8 клас: Дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. шк., гімназій, ліцэяў/І. Л. Бурак, П. А. Міхайлаў, Т. А. Мытнік, Н. У. Чайка; Пад рэд. П. А. Міхайлава. — 2-е выд. — Мн.: «Аверсэв», 2003. — 224 с.
ISBN 985-478-208-5.

Дапаможнік прызначаны настаўнікам і навучэнцам школ, гімназій і ліцэяў для замацавання і ўдасканальвання сваіх ведаў па беларускай мове.

Раздзелы дапаможніка адпавядаюць асноўным навучальным тэмам праграмы агульнаадукацыйнай школы і падручнікаў для навучэнцаў 8 класа.

**УДК 808.26(075.3)**
**ББК 81.2Беи-922**

*Вучэбнае выданне*

**Бурак** Ірына Леанідаўна
**Міхайлаў** Павел Аляксандравіч
**Мытнік** Таццяна Аляксандраўна
**Чайка** Наталля Уладзіміраўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**
**Дыктанты, пераказы, пераклады**
**8 клас**
Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў
*2-е выданне*

Адказны за выпуск *Дз. Л. Дзямбоўскі*

Падпісана ў друк з гатовых дыяпазітываў 24.07.2003. Фармат 84×108 1/32.
Папера друкарская № 2. Гарнітура «Школьная». Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 11,76. Ул.-выд. арк. 7,54. Тыраж 5100 экз. Зак. 166.
Пасведчанне № 08-33-0.156048
аб дзяржаўнай гігіенічнай рэгістрацыі прадукту ад 13.12.200.
Таварыства з дадатковай адказнасцю «Аверсэв».
Ліцэнзія ЛВ № 106 ад 25.07.2002. Кантактны тэлефон (017) 210-18-8.
E-mail: info@aversev.com; www.aversev.com
Рэспубліка Беларусь, 220123, Мінск, М. Багдановіча, 129а.
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
220013, Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79.

ISBN 985-478-208-5
© Калектыў аўтараў, 2002
© Афармленне. ТДА «Аверсэв», 2002

## ПРАДМОВА

*Гэты дапаможнік прызначаны настаўнікам і навучэнцам школ, гімназій і ліцэяў для замацавання і ўдасканальвання сваіх ведаў па беларускай мове. Ён складзены ў поўнай адпаведнасці з дзеючай вучэбнай праграмай і падручнікамі па беларускай мове для 8 класа школ з рускай і беларускай мовамі навучання, а таксама з улікам «Адзінага моўнага і арфаграфічнага рэжыму школы»*.*

*Кніга складаецца з дзевяці самастойных раздзелаў: «Словазлучэнне», «Сказ», «Просты сказ: двухсастаўныя сказы», «Просты сказ: аднасастаўныя сказы», «Просты сказ: няпоўныя сказы», «Просты сказ: сказы з аднароднымі членамі», «Просты сказ: сказы са звароткамі, пабочнымі словамі і выклічнікамі», «Просты сказ: сказы з адасобленымі членамі», «Спосабы перадачы чужой мовы». Гэтыя раздзелы адпавядаюць асобным навучальным тэмам і размяшчаюцца строга ў паслядоўнасці, вызначанай вучэбнай праграмай і падручнікамі для навучэнцаў 8 класа.*

*Кожны асобны раздзел змяшчае тры віды пісьмовых прац — дыктанты, пераказы і пераклады, мэтанакіравана*

---

* Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з беларускай мовай навучання: Беларуская мова. V—XI класы. — Мн., 2000.

Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з рускай мовай навучання: Беларуская мова. V—XI класы. — Мн., 2000.

Антанюк Л. А., Бадзевіч З. І., Кныш М. К., Саматыя І. М. Беларуская мова: Сінтаксіс і пунктуацыя: Падручнік для 8 класа школ з беларускай мовай навучання. Выданне другое. — Мн., 2001.

Тамашэвіч Т. І. Беларуская мова: Падручнік для 8 класа школ з рускай мовай навучання. — Мн., 1999.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

а ты ещё ничего не сделал. Неизвестно даже, есть ли у тебя какие-нибудь таланты. А хочется большой, бурной жизни! Хочется писать стихи, чтобы вся страна знала их наизусть, или сочинить героическую симфонию и выйти потом к оркестру...

*Ю. Казаков*

III. Все в деревне звали его Алёшей Бесконвойным. А звали его так вот за что: за редкую в наши дни безответственность, неуправляемость. Два дня он не работал в колхозе: субботу и воскресенье. Пробовали, конечно, повлиять на него, и не раз, но всё без толку. Так и махнули на него рукой. А что сделаешь? Убеждай его, не убеждай — как об стенку горох.

*По В. Шукшину*

**СЛОЎНІК**

черты́ лица́ — ры́сы тва́ру
впечатле́ние — ура́жанне
прико́вывать внима́ние — прыця́гваць ува́гу
безотве́тственность — безадка́знасць
неуправля́емость — некіру́емасць
повлия́ть — паўплыва́ць, аказа́ць уплыў
убежда́ть — перако́нваць

**ЗАДАННІ**

1. Перакласці тэксты на беларускую мову.
2. Падкрэсліць аднасастаўныя сказы, а таксама часткі складаных сказаў, якія маюць будову аднасастаўных сказаў. Указаць тыпы аднасастаўных сказаў.
3. Вызначыць сэнсава-стылістычную ролю аднасастаўных сказаў у тэксце.

# ПРОСТЫ СКАЗ:
## НЯПОЎНЫЯ СКАЗЫ

## ДЫКТАНТЫ

### ПАПЕРАДЖАЛЬНЫ ДЫКТАНТ

**Дарога ў навуку**

Цяпер ужо Францішак — бакалаўр. І хоць сам яшчэ далей вучыўся, але ўжо мог адначасна і вучыць у школах, якія належалі універсітэту. **Замест ранейшай студэнцкай формы на ім — чатырохраговы берэт, а на канцы рукавоў тунікі — чырвоная матэрыя.** Так абавязаў звычай.

**Перад Францішкам — далейшая дарога ў навуку.** Пасля яшчэ некалькіх гадоў вучобы ён мае права здаваць экзамен на доктара філасофіі.

І Скарына здасць яго і будзе доктарам філасофіі. Але гэта адбудзецца, відаць, ужо не ў Кракаве.

Дзе, у якім універсітэце абараніў ён ступень доктара філасофіі, пра гэта пакуль што маўчыць гісторыя.

Вядома толькі, што ў 1509 годзе перад эпідэміяй усе магістры ўцяклі з Кракава. Ці не было гэта прычынаю, чаму вымушаны быў пакінуць горад і Францішак? Але гэта толькі здагадкі. (121 слова)

*Паводле А. Клышкі*

**ЗАДАННЕ**

Вызначыць, які член апушчаны ў выдзеленых сказах. Як называюцца такія сказы?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## КАМЕНЦІРАВАНЫ ДЫКТАНТ

### Ліпеньская раніца

А слаўна-такі ўстаць да сонца, як прырода толькі што пачне прачынацца ад кароткага летняга сну, выйсці на прастор і прайсці некалькі вёрст па расе на чыстым паветры! Дзень ледзь-ледзь занімаецца. Над лесам і полем яшчэ — цемната. Над лугам — тонкая посцілка белаватага туману. Неба на ўсходзе чырванее. Раннія жаваранкі затрапяталі ў небе крыламі, і льецца іх вясёленькая песня. Тым часам хлопцы выйшлі ў лес. Верхавіны высокіх хвой ужо залаціліся першымі промнямі сонца, ціха стаялі, не варушыліся. Недзе высока над імі, бачна, ці на іх верхавінах звінелі мошкі, і здавалася, што лес маліўся богу ў ціхі час раніцы. Птушкі шчабечуць на ўсе лады. Спявае дрозд, пераклікаюцца сойкі, крычыць жаўна, стукае дзяцел па дрэве сваёй моцнай дзюбай. Далёка-далёка, у гушчары яловага лесу, варкуе голуб. І ўсюды — сонца, лета, цяпло і прыгажосць. (128 слоў)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці ў тэксце і выпісаць няпоўныя сказы.
2. Вызначыць, які член у іх апушчаны.

## ДЫКТАНТ «ПІСЬМО ПА ПАМЯЦІ»

### Сум па радзіме

Міндоўг, як, бадай, кожны літоўскі князь, ведаў толк у паляванні, змалку любіў яго. Мужчыны ўсхвалявана пачалі абмяркоўваць заўтрашнія ловы. І толькі Ганна-Паята, самотная душа, сядзела на сваёй канапе, рабіла выгляд, што ўважліва слухае іх, а думкі былі далёка-далёка адсюль, у нейкім захмар'і. Нездарма кажуць, што моль адзенне есць, а смутак — чалавека. У думках варуцкай княгіні — заліты гарачымі промнямі



Афон, блакітнае ціхае мора, белыя сцены манастыроў, на якіх раскашуецца, лезе ўверх ап'янелая ад сонца вінаградная лаза. Там, у той сонечнай цішыні, — смуглыя велікавокія людзі, што харчуюцца мёдам дзікіх пчол і акрыдамі, маладой смажанай саранчой. Як хацелася ёй туды з гэтай лясной глушэчы, ад крыві і страху, ад бясконцых незразумелых войнаў. Там ёсць месцы, дзе нават забаронена араць зямлю, бо зямля — жывая, і саха земляроба можа прычыніць ёй боль. (127 слоў)

*Паводле Л. Дайнекі*

**ЗАДАННІ**

1. Завучыць тэкст і запісаць яго па памяці.
2. Знайсці ў тэксце і падкрэсліць няпоўныя сказы.

## ДЫКТАНТ «ПРАВЯРАЮ СЯБЕ»

### Рыбалка

Калі мы былі зусім малыя, то баяліся на Прыцава хадзіць. А потым, як падраслі, пасмялелі. І кожны дзень, прыгнаўшы з поля кароў, коней, авечак, беглі купацца. Берагі на гэтым Прыцаве былі дрыгвяністыя. Бывала, распранаемся — і ў рэчку. А глыбіня там была неймаверная. Хлопцы звязвалі дзве жэрдкі і не маглі дастаць дна.

Затое і рыбы тут кішэла.

Пад сплавам раскашавалі бліскучыя, нібы залатыя, карасі, віхлялі рудыя паласатыя ўюны. Гарачым летнім днём з твані падымаліся на нераст ліні, цёмна-жоўтыя, нібы бронзавыя. На жыўца браліся зялёныя, як і сама вада, шчупакі. А ў тых месцах, дзе былі сухія абрывістыя берагі, мы лавілі на пастаражні мянькоў. На кручок чаплялі маленькую жабку, калі не было лепшага жыўца, і пастаражні ставілі нанач. Паставіш штук дзесяць, а раніцой на світанні прыбяжыш — на кожным кручку мянёк. Схопіць прынаду — і ў нару. Ты за вудзільна — і сюды яго, на бераг. (141 слова)

*Паводле В. Дайліды*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ЗАДАННЕ**

Знайсці ў тэксце і падкрэсліць няпоўныя сказы. Праверыць сябе.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

### Вялікі асветнік

Францыск ідзе знаёмымі вулачкамі вялікага і старога горада. Так ён з замілаваннем называў у сваіх прадмовах Прагу, што калісь дала прытулак яму і яго вялікай справе.

Зноў вярталіся ў памяці тыя поўныя натхнення і парывання лепшыя часіны жыцця, калі ён дні і ночы сядзеў за сталом, рыхтуючы рукапісы, робячы пераклад, пішучы прадмовы і пасляслоўі, радуючыся ўдалым гравюрам і, нарэшце, трымаючы ў руках першыя друкаваныя адбіткі...

Падумаць толькі — як працавалася: у тысяча пяцьсот семнаццатым годзе — чатыры кнігі ў шэсцьсот сорак шэсць старонак, у тысяча пяцьсот васемнаццатым годзе — восем кніг у семсот чатыры старонкі, у тысяча пяцьсот дзевятнаццатым годзе — адзінаццаць кніг у тысячу старонак. Такім чынам, штомесяц — прыкладна, па шэсцьдзесят-восемдзесят старонак...

Настаў час яго вялікіх надзей, якія пачыналі нарэшце здзяйсняцца. (119 слоў)

*Паводле А. Клышкі*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці і падкрэсліць няпоўныя сказы.
2. Знайсці ў тэксце і выпісаць лічэбнікі. Вызначыць іх разрад.

### Цішыня

Вуліца сустрэла Якімку незвычайнай цішынёй. Не чутно было скрыпу калодзежных жураўлёў, такога характэрнага для гэтай пары сутак, не ляскалі брамкі, нават шпакі не перасвістваліся на ліпах. З канца ў канец вуліцы — ні жывой душы.

Толькі — цішыня. Цягуча-трывожная, напружаная, як да адказу нацягнутая струна. Крані — і яна адразу лопне. З трэскам і звонам.

Гэта цішыня душыла, прыгнятала Якімку. Самаадчуванне ў яго было такое, быццам над галавой навісла нешта пагражальна-важкае, што ніяк немагчыма прадухіліць. Яно, гэта нешта, вось-вось абрушыцца на яго, і тады ўсё знікне. І гэта блакітнае, без адзінай хмурынкі неба, і застылыя ў нерухомасці веліканы-ліпы, і зялёны, усыпаны жоўтымі кветкамі трыпутніку, прыдарожны мурог...

Якімка перайшоў на другі бок вуліцы і накіраваўся да Васі. Вася ўжо чакаў яго. (117 слоў)

*Паводле Я. Курто*

**ЗАДАННІ**

1. Выпісаць няпоўныя сказы.
2. Указаць (у дужках), якія члены сказа ў іх прапушчаны.

## ПЕРАКАЗЫ

### Літаратурны музей Янкі Купалы

У цэнтры Мінска ў засені маладых ліп і каштанаў стаіць акружаны кветкамі невялікі двухпавярховы дом. А непадалёку — ціхаплынная Свіслач. Гэта Літаратурны музей народнага паэта Беларусі Янкі Купалы (Івана Дамінікавіча Луцэвіча).

Янка Купала. Калі гучыць гэта імя, перад вачамі ўстаюць адкрытыя сонцу зялёныя жытнёвыя палеткі, шырокія квяцістыя лугі пад лёгкімі аблачынамі, векавечныя лясы і пушчы, сінія стужкі павольных рэк — уся наша Беларусь.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

## Змест


*Прадмова* ... 3

**СЛОВАЗЛУЧЭННЕ**

ДЫКТАНТЫ ... 7

Папераджальны дыктант ... 7
Каменціраваны дыктант ... 8
Творчы дыктант ... 9
Вольны дыктант ... 9
Дыктант «Пісьмо па памяці» ... 10
Дыктант «Правяраю сябе» ... 11
Выбарачныя дыктанты ... 12
Кантрольны дыктант ... 12

ПЕРАКАЗЫ ... 13

ПЕРАКЛАДЫ ... 20

Пераклад-пераказ ... 29

**СКАЗ**

ДЫКТАНТЫ ... 33

Папераджальныя дыктанты ... 33
Каменціраваныя дыктанты ... 34
Тлумачальны дыктант ... 36
Вольны дыктант ... 37
Дыктанты «Пісьмо па памяці» ... 37
Дыктант «Правяраю сябе» ... 39
Выбарачны дыктант ... 40
Кантрольныя дыктанты ... 40

ПЕРАКАЗЫ ... 42

ПЕРАКЛАДЫ ... 49

Пераклад-пераказ ... 50

**ПРОСТЫ СКАЗ: двухсастаўныя сказы**

ДЫКТАНТЫ ... 53

Папераджальны дыктант ... 53
Каменціраваны дыктант ... 54
Тлумачальны дыктант ... 54
Творчыя дыктанты ... 55
Вольныя дыктанты ... 56
Выбарачныя дыктанты ... 60





Дыктант «Пісьмо па памяці» ... 61
Дыктант «Правяраю сябе» ... 62
Кантрольныя дыктанты ... 63

ПЕРАКАЗЫ ... 66

ПЕРАКЛАДЫ ... 74

**ПРОСТЫ СКАЗ: аднасастаўныя сказы**

ДЫКТАНТЫ ... 91

Папераджальны дыктант ... 91
Каменціраваныя дыктанты ... 92
Тлумачальны дыктант ... 93
Творчы дыктант ... 94
Вольны дыктант ... 94
Выбарачны дыктант ... 95
Дыктант «Пісьмо па памяці» ... 96
Дыктант «Правяраю сябе» ... 97
Кантрольныя дыктанты ... 97

ПЕРАКАЗЫ ... 99

ПЕРАКЛАДЫ ... 107

**ПРОСТЫ СКАЗ: няпоўныя сказы**

ДЫКТАНТЫ ... 109

Папераджальны дыктант ... 109
Каменціраваны дыктант ... 110
Дыктант «Пісьмо па памяці» ... 110
Дыктант «Правяраю сябе» ... 111
Кантрольныя дыктанты ... 112

ПЕРАКАЗЫ ... 113

ПЕРАКЛАДЫ ... 119

**ПРОСТЫ СКАЗ: сказы з аднароднымі членамі**

ДЫКТАНТЫ ... 121

Папераджальныя дыктанты ... 121
Каменціраваныя дыктанты ... 123
Тлумачальны дыктант ... 124
Творчыя дыктанты ... 125
Вольны дыктант ... 126
Выбарачныя дыктанты ... 127
Дыктант «Пісьмо па памяці» ... 129
Дыктант «Правяраю сябе» ... 129
Кантрольныя дыктанты ... 130

ПЕРАКАЗЫ ... 132

ПЕРАКЛАДЫ ... 140




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПРОСТЫ СКАЗ: сказы са зваротками, пабочнымі словамі і выклічнікамі


ДЫКТАНТЫ ... 146

Тлумачальны дыктант ... 146
Вольныя дыктанты ... 147
Выбарачны дыктант ... 149
Дыктант «Пісьмо па памяці» ... 149
Дыктант «Правяраю сябе» ... 150
Кантрольны дыктант ... 151

ПЕРАКАЗЫ ... 152

ПЕРАКЛАДЫ ... 157


## ПРОСТЫ СКАЗ: сказы з адасобленымі членамі


ДЫКТАНТЫ ... 162

Папераджальны дыктант ... 162
Каменціраваны дыктант ... 163
Тлумачальны дыктант ... 164
Вольныя дыктанты ... 164
Выбарачныя дыктанты ... 166
Дыктант «Пісьмо па памяці» ... 167
Дыктант «Правяраю сябе» ... 168
Кантрольныя дыктанты ... 169

ПЕРАКАЗЫ ... 171

ПЕРАКЛАДЫ ... 179


## СПОСАБЫ ПЕРАДАЧЫ ЧУЖОЙ МОВЫ


ДЫКТАНТЫ ... 192

Папераджальныя дыктанты ... 192
Каменціраваны дыктант ... 193
Творчы дыктант ... 194
Вольны дыктант ... 195
Выбарачны дыктант ... 195
Кантрольны дыктант ... 196

ПЕРАКАЗЫ ... 197

ПЕРАКЛАДЫ ... 204

Пераклады-пераказы ... 206


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ